■ Віншуем калегу!

Высокая ўзнагарода — за творчасць і адказнасць

Учора прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч па даручэнні кіраўніка дзяржавы ўручыў дзяржузнагароды заслужаным людзям Беларусі.

«Заўсёды ў працоўных калектывах ёсць людзі, якія крэатыўныя ва ўсіх адносінах, яны імкнуцца зрабіць усё лепш, — адзначыў прэм'ер-міністр. — І калі гэта дае нейкія дадатковыя эканамічныя рашэнні, прыносіць выгаду прадпрыемству, то, безумоўна, заслугоўвае заахвочвання».

Усё вышэйсказанае — і пра нашага калегу, паэта, намесніка дырэктара РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» — галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» Алеся Бадака, які ўчора атрымаў з рук прэм'ер-міністра медаль Францыска Скарыны. Алесь Мікалаевіч, вядомы пісьменнік, сапраўды творчы ва ўсім, у тым ліку і на сваёй адказнай пасадзе. За час яго кіравання ўзняўся на новы якасны ўзровень часопіс «Нёман», часопіс «Полымя», які ён узначальвае зараз, таксама мяняецца ў бок сучасных тэндэнцый у літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Пры гэтым Алесь Бадак паспявае пісаць новыя творы, якія знаходзяць водгук у сэрцах чытачоў.

Шчыра віншуем калегу з узнагародай і зычым яму натхнення, новых вершаў і новых дасягнутых вяршынь!

У бізнесмены я пайшоў бы... Хай мяне навучаць!

Учора на Гомельшчыне ў рамках адзінага дня інфармавання вялі размову аб стварэнні ўмоў для развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва.

На тэрыторыі вобласці зараз зарэгістравана больш за 39 тысяч суб'ектаў малога і сярэдняга бізнесу. Аналіз размеркавання малых і сярэдніх прадпрыемстваў па раёнах вобласці паказвае, што вялікая іх частка сканцэнтравана ў горадзе Гомелі, Мазырскім, Жлобінскім, Светлагорскім, Гомельскім і Рэчыцкім раёнах.

Інфармацыйныя групы аблвыканкама пабывалі ў большасці раёнаў вобласці, сустрэліся з людзьмі, якія цікавяцца магчымасцю стварэння ўласнага прадпрыемства. Дарэчы, прыватны бізнес на Гомельшчыне сёння значна ўплывае на развіццё сельскіх тэрыторый вобласці. Чвэрць з зарэгістраваных сёлета прадпрыемстваў знаходзяцца ў сельскай мясцовасці і ў малых гарадах, дзе дзейнічаюць пэўныя льготы. Пра іх, а таксама пра дзяржаўныя дакументы, якія спрыяюць адкрыццю сваёй справы, ішла гутарка ў працоўных калектывах вобласці. Сёння прыкладна 18,5% сродкаў у бюджэт Гомельшчыны забяспечваюць прадпрымальнікі. З пачатку года па накіраваннях органаў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне было арганізавана навучанне 300 чалавек па адукацыйнай праграме курса «Асновы прадпрымальніцтва». Такім чынам, стварэнне ўмоў і падтрымка малога і сярэдняга прадпрымальніцтва ў Гомельскай вобласці дазваляюць вырашаць не толькі эканамічныя, але і сацыяльныя пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

■ Даходы з адходаў

ЗДАЦЬ СТАРУЮ ТЭХНІКУ... У КРАМУ

Наколькі гандлёвыя прадпрыемствы падрыхтаваны да новаўвядзення?

Нядаўна пачала дзейнічаць пастанова Савета Міністраў №1124, згодна з якой у крамах, што вядуць рознічны гандаль, пачнуць збіраць адходы электроннага і электрычнага абсталявання (далей — ЭЭА) і ўпакоўку (папера і кардон, шкло, пластык) ад насельніцтва. Гэта складаная бытавая тэхніка, электроніка, асвятляльныя прыборы, цацкі, медыцынскае абсталяванне, батарэйкі, лямпачкі, якія змяшчаюць ртуць.

Супрацоўнік па хімічнай бяспецы Цэнтра экалагічных рашэнняў Анатоль КАЛАЧ патлумачыў, чаму адходы ЭЭА становяцца праблемай:

— З кожным годам аб'ёмы вытворчасці названых тавараў павялічваюцца, а тэрмін службы раней прададзеных скарачаецца. Калі некалі халадзільнікі працавалі па 30-40 гадоў, зараз яны ледзь «вытрымліваюць» дзесяцігоддзе. Іх рамонтапрыгоднасць пад сумненнем: па кошце танней набыць новы халадзільнік.

У выніку палігоны з цвёрдымі бытавымі адходамі вельмі хутка запаўняюцца старой тэхнікай. Альбо забруджваюць наваколле, «сумуючы» на дваравых сметніках. А ў электроніцы змяшчаюцца шкодныя рэчывы. Для даведкі: у кінескопе старога тэлевізара знаходзіцца да 2 кілаграмаў свінцу!

Пачынаючы з 1 студзеня, адходы ЭЭА і ўпакоўку будуць прымаць у 3128 крамах (сёння іх налічваецца прыкладна 400).

Галоўны спецыяліст дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў» Сяргей ЮРЧА больш дэталёва патлумачыў, што зменіцца ў сістэме збору адходаў ЭЭА:

— Абавязак па іх прыёме ад фізічных асоб распаўсюджваецца не на ўсе аб'екты рознічнага гандлю — гэта залежыць ад плошчы крамы і яе спецыялізацыі. Так, упакоўку могуць прымаць крамы гандлёвай плошчай больш за 1000 квадратных метраў. Для кожнага віду прадугледжаны асобны кантэйнер. Батарэйкі можна будзе здаць супрацоўніку крамы альбо пакідаць у кантэйнерах. Правіла працуе для любога тыпу крамы, плошча якой большая за 100 квадратных метраў. Тэхніку забяруць ва ўніверсальных гандлёвых аб'ектах плошчай ад 1000 «квадратаў» альбо ў камбінаваных (ад 500 квадратных метраў). Для буйнагабарытнай прадугледжаны пляцоўкі ў краме ці каля яе. Ртутныя лямпачкі можна будзе аднесці ў крамы з плошчай больш за 400 квадратных метраў. Для «змеек» таксама ёсць патрабаванне — яны павінны быць цэлымі.

У пастанове прапісаны і канкрэтныя параметры кантэйнера: канструкцыя ні ў якім разе не павінна прывесці да разбівання лямпачкі. Супрацоўнікі прадпрыемства па перапрацоўцы і ўтылізацыі адходаў ААТ «БелВТІ» прадэманстравалі падобныя «скрынкі», зробленыя са звычайнага кардону. Яны не надта вялікія, таму закінуць лямпачку не атрымаецца — толькі акуратна пакласці.

Дадатковая ўмова — гэта размяшчэнне ў крамах інфармацыйных стэндаў, дзе будзе пазначана месцазнаходжанне пункта збору адходаў і від адходаў, які тут прымаюць.

Са старой тэхнікі можна «выцягнуць» карысныя другасныя рэсурсы і атрымаць прыбытак: напрыклад, з тоны адходаў выходзіць ад 4 да 8 грамаў каштоўных металаў.

А што далей? Крамы маюць права перадаваць адходы зацікаўленым юрыдычным асобам — нарыхтоўчым установам, якія займаюцца абяшкоджваннем адходаў. У кожным рэгіёне будуць прызначаны арганізацыі, адказныя за збор. У рэшце рэшт, крамы і гандлёвыя сеткі змогуць атрымаць грашовую кампенсацыю за збор адходаў.

Хаця пастанова пачала дзейнічаць, у «зборшчыкаў» застаюцца пытанні. Пра некаторыя з іх расказаў кіраўнік аддзела прававой і кадравай працы ААТ «Электрасэрвіс і Ка» (гандлёвая сетка «Электрасіла») Дзмітрый КАЖЭЎНІКАЎ:

— Асобныя групы тавараў не трапляюць пад азначэнне буйной, сярэдняй, дробнай бытавой тэхнікі і таму фармальна яны «выпадаюць» са спіса. Гэта ўсім вядомыя варачныя паверхні і духавыя шафы. І што з імі рабіць?

Іншая праблема — права ўласнасці. Незразумелым для буйных гандлёвых сетак застаецца пытанне пра бухгалтарскі ўлік. Атрымліваецца, калі ў крамах збіраюць адходы бясплатна, то, згодна з Падатковым кодэксам, яны павінны плаціць за гэта падатак. Аднак пакуль бухгалтары буйных крам «ламаюць галаву» над дэталямі новай пастановы, наладжаная сістэма ўжо даўно распрацавана спецыялістамі «БелВТІ», якія запрашаюць буйныя гандлёвыя сеткі да супрацоўніцтва. Яны зразумелі, што са старой тэхнікі можна «выцягнуць» карысныя другасныя рэсурсы і атрымаць прыбытак: напрыклад, з тоны адходаў выходзіць ад 4 да 8 грамаў каштоўных металаў. Удала дзейнічае паслуга «БелВТІ-таксі» — груваткую тэхніку забіраюць і бясплатна адвозяць на пункт збору. За год ад юрыдычных і фізічных асоб сабрана 650 тон адходаў.

Зараз стаіць і праблема з батарэйкамі. Пакуль у Беларусі няма прадпрыемства па іх перапрацоўцы і абяшкоджванні, мы можам толькі збіраць іх. Дырэктар ААТ «БелВТІ» Аляксандр КІРПІЧНІК адзначыў, што пакуль што весці гаворку пра будаўніцтва прадпрыемства, якое сябе акупляе, рана:

— Атрымаць прыбытак можна пры лічбе 100 тон батарэек у год, а мы назбіралі прыкладна 20 тон за два гады, — падсумаваў спецыяліст.

Прадстаўнікі гандлёвых сетак адзначылі, што яны будуць праводзіць стымулюючыя акцыі кшталту бясплатнай дастаўкі буйнагабарытнай тэхнікі за здадзеныя адходы альбо прадастаўляць кліентам зніжкі на прадукцыю.

Кацярына РАДЗЮК

■

■ Не парушай!

Ссек елку — плаці 45 мільёнаў

Міністэрства лясной гаспадаркі перайшло на ўзмоцнены рэжым аховы лясоў для недапушчэння высечак хваёвых дрэў у сувязі з навагоднімі святамі.

Аператыўныя рэйдавыя мерапрыемствы будуць праводзіцца Мінлясгасам сумесна з Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, прадстаўнікамі міністэрстваў прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і ўнутраных спраў. На дарогах краіны будзе выстаўлена каля 300 кантрольных пастоў.

За незаконнае знішчэнне, выняцце ці пашкоджанне дрэў і кустарнікаў, што растуць у лясах першай групы (якія не эксплуатуюцца ў лясной гаспадарцы), для фізічных асоб прадугледжаны штрафы ў памеры ад 5 да 50 базавых (ад 750 тысяч да 7,5 мільёна рублёў). Індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы могуць быць пакараны штрафам, адпаведна, да 30 і 45 мільёнаў рублёў. За пашкоджанне лесу другой групы фізічныя асобы могуць быць пакараны штрафам да 30 базавых (4,5 мільёна), індывідуальныя прадпрымальнікі — да 150 базавых (22,5 мільёна), юрыдычныя асобы — да 300 базавых (45 мільёнаў).

Падрыхтавацца да свят можна без парушэння закону: з 22 снежня па ўсёй краіне будзе арганізавана каля 1000 гандлёвых пунктаў, дзе можна набыць навагоднія дрэвы па прымальных цэнах — ад 50 тысяч рублёў. Вясковыя жыхары і іншыя ахвотныя могуць набыць елку ў сваім лясніцтве па яшчэ больш нізкіх цэнах.

Па словах **начальніка ўпраўлення лясной гаспадаркі Мінлясгаса Мікалая ЮРЭВІЧА,** попыт на натуральныя навагоднія дрэвы ў апошнія гады значна знізіўся. Калі напрыканцы 1980-х — пачатку 1990-х Беларусь экспартавала ў краіны былога Савецкага Саюза каля 1,5 мільёна дрэў штогод, то цяпер аб'ёмы рэалізацыі елак у Беларусі і за мяжу складаюць каля 200 тысяч адзінак. Каля 2,7 мільёна беларускіх навагодніх дрэў вырошчваюцца цяпер на 800 гектарах спецыяльных плантацый.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ

■

ХУТКА І БЯСПЕЧНА

Пачалася электрыфікацыя чыгуначнай веткі, якая вядзе з Вільнюса (станцыя Науёі — Вільня) да мяжы з Беларуссю. На ўрачыстай цырымоніі пачатку работ прысутнічаў і прэм'ер Літвы Альгірдас Буткявічус.

«Электрыфікацыя чыгуначнай веткі, якая злучае нас з Беларуссю, павысіць прывабнасць чыгуначнага транспарту ў сферах перавозкі грузаў і пасажыраў і знізіць забруджванне атмасферы. Пра гэта мы нядаўна гаварылі з прэм'ерам Беларусі. Паспяховае завяршэнне гэтага праекта будзе спрыяць і ўмацаванню двухбаковых літоўска-беларускіх сувязяў, — заявіў А. Буткявічус. — Нам вельмі важна, каб грузы ў Клайпедскі порт дастаўляліся хутка і бяспечна. У будучыні чыгунка ад мяжы з Беларуссю да Клайпеды павінна стаць асноўным калідорам грузаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана, краін Сярэдняй Азіі і Кітая».

Гэты праект мяркуецца завяршыць у сакавіку 2016 года. У цэлым будзе электрыфікавана 28,6 кіламетра чыгуначнага пуці, а таксама рэканструявана цягавая падстанцыя ў Вільнюскім мікрараёне Науёі — Вільня.

Пасля электрыфікацыі гэтай чыгуначнай веткі паміж Вільнюсам і Мінскам дызельныя лакаматывы будуць заменены электрычкамі, якія не забруджваюць атмасферу, больш магутныя, едуць хутчэй. Акрамя таго, электрычкамі везці грузы і пасажыраў танней. Тады пачнуць курсіраваць камфартабельныя двухпавярховыя пасажырскія цягнікі, якія ўжо 4 гады паспяхова эксплуатуюцца на лініі Вільнюс — Каўнас. Літва ўжо заказала тры новыя двухпавярховыя электрычкі для абслугоўвання маршруту Вільнюс — Мінск. Яны развіваюць хуткасць да 160 км за гадзіну. Час у дарозе скароціцца з 3 да 2 гадзін.

Вітаўтас ЖЭЙМАНТАС,
уласны карэспандэнт «Звязды» ў Літве.
Вільнюс.